6. Сурганова Е. Что еще бумага стерпит // Lenta.ru. 2013. 13 мая [Электронный ресурс]. URL: https://lenta.ru/articles/2013/05/13/technology/ (дата обращения: 13.08.2019).
7. Как дополненную реальность используют в прессе: учитесь у лучших! // AR/VR/MR Conference. 2014. 10 июня [Электронный ресурс]. URL: https://ar-conf.ru/ru/news/kak-dopolnennuyu-realnost-ispolzuyut-v-presse-uchites-u-luchshih (дата обращения: 16.07.2019).
8. Crowley D. Innovation in print // InPublishing. 2011. July-August. P. 12–14.
9. Ласко Д. 12 аргументов, убеждающих в том, что печатные СМИ не уйдут в прошлое // МедиаПрофи. 2015. 7 октября [Электронный ресурс]. URL: http://mediaprofi.org/media-info/news/item/2927-pressa_argumety_za (дата обращения: 11.08.2019).

# ПРАБЛЕМА МЕТАДАЛАГІЧНАГА ПАДЫХОДУ ДА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЖУРНАЛІСТЫКІ

***Н. А. Зубчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Zubchon@bsu.by*

У артыкуле актуалізуецца праблема метадалагічнага падыходу да гісторыі беларускай журналістыкі, абумоўленая складанымі сучаснымі трансфармацыямі ідэалогіі, поглядаў на журналістыку, глабалізацыйнымі працэсамі. Прадстаўлены аўтарскі падыход да вызначэння этапаў развіцця айчыннай медыяпрасторы.

***Ключавыя словы:*** метадалогія; перыядызацыя; беларуская журналістыка; гісторыя развіцця; дзяржаўная ідэалогія.

# THE PROBLEM OF METHODOLOGICAL APPROACH TO HISTORY BELARUSIAN JOURNALISM

***N. A. Zubchonok***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004 Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. A. Zubchonak (Zubchon@bsu.by)*

The article actualizes the problem of methodological approach to the history of Belarusian journalism due to complex modern transformations of ideology, views

on journalism, globalization processes. The author's approach to determining the stages of development of the domestic media space is presented.

***Keywords:*** methodology; periodization; Belarusian journalism; history of development; state ideology.

Глабалізацыйныя працэсы ва ўсіх сферах жыцця, поўная трансфармацыя сучаснай інфармацыйнай прасторы, мадэрнізацыя працэсу адукацыі абсалютна заканамерна прыводзяць да асэнсавання таго, што кардынальных змен патрабуюць многія аспекты як прафесійнай журналісцкай дзейнасці, так і навукова-тэарэтычнай. Гісторыя журналістыкі ў дадзеным выпадку не з'яўляецца выключэннем.

У савецкі час, калі, па сутнасці, была сфарміравана навуковая школа журналістыкі, на працягу многіх гадоў працэс развіцця беларускіх медыя прадстаўляўся ў кантэксце расійскай сістэмы. На гэта былі і ёсць аб'ектыўныя прычыны, і галоўная – дзяржаўная нявызначанасць тэрыторыі нашай краіны. Агульнавядома, што з канца XVIII ст. беларускія землі ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі і тыя выданні, якія выходзілі ў Паўночна-Заходнім краі, аўтаматычна лічыліся расійскімі, паколькі друкаваліся на рускай мове, а іх дзейнасць рэгулявалася расійскім заканадаўствам. Уключэнне Беларусі ў склад СССР у пачатку XX ст. ізноў абумовіла функцыянаванне яе сродкаў масавай інфармацыі як рэгіянальнай часткі медыяпрасторы вялікай краіны.

Па гэтай прычыне практычна ўсе навуковыя даследаванні, якія праводзіліся ў межах вывучэння гісторыі беларускай журналістыкі, адпавядалі пэўным метадалагічным крытэрыям, прынятым яшчэ ў 50–70-х гг. XX ст. Так, асноўнымі напрамкамі вывучэння гісторыі медыя як асобнай дысцыпліны, прапанаванымі вядомымі расійскімі даследчыкамі А. В. Западавым і Б. І. Есіным, былі наступныя: агульныя пытанні развіцця перыядычнага друку; вывучэнне грамадска-палітычнага накірунку часопісаў і газет як выразнікаў ідэалогіі і практыкі пэўных грамадскіх груп, іх узаемаадносін і палемікі паміж імі; развіццё часопісаў і газет як спецыяльных відаў друкаванай прадукцыі; арганізацыя і склад выданняў; вывучэнне і ацэнка дзейнасці вядомых рэдактараў, выдаўцоў і супрацоўнікаў перыядычнага друку, аналіз іх літаратурна-публіцыстычнага майстэрства і інш. На гэтых прынцыпах была арганізавана ў савецкі час дзейнасць вядомых навуковых гістарычных школ у Маскве, Ленінградзе і іншых саюзных гарадах [1].

У адпаведным метадалагічным напрамку праводзілася даследаванне гісторыі беларускай журналістыкі вядомымі айчыннымі навукоўцамі.

Класічнай працай стаў першы падручнік «Беларуская журналістыка» Р. В. Булацкага, С. В. Говіна, І. І. Сачанкі, выдадзены ў БДУ у 1979 г. і ўдастоены Дзяржаўнай прэміі БССР. Акрамя гэтага, беларускімі вучонымі было падрыхтавана яшчэ нямала значных навуковых прац: Р. В. Булацкі «Первые рабселькоры Белоруссии» (1969), С. В. Говін «Друк Заходняй Беларусі» (1974), С. В. Марцэлеў «Печать Советской Белоруссии: исторический очерк» (1967) і інш. Даследаванне працэсу развіцця сродкаў масавай інфармацыі адбывалася ў рамках агульнага фарміравання савецкай гуманітарнай навукі і ў адпаведнасці з ідэалагічнымі задачамі эпохі. Нягледзячы на дастаткова неадназначную ацэнку гэтага перыяду ў сучасных умовах, нельга не адзначыць, што менавіта ў савецкі час якраз і была выпрацавана грунтоўная метадалогія вывучэння розных аспектаў журналістыкі, цалкам абвергнуць якую сёння яшчэ не ўяўляецца магчымым.

Тым не менш абсалютна аб’ектыўна патрабуюць пераасэнсавання сёння многія гістарычныя факты і працэсы. Рэспубліка Беларусь мае вопыт незалежнага дэмакратычнага ладу, развіваецца ў рэчышчы сусветных сацыяльна-палітычных і культурных тэндэнцый. Беларускі народ стварае новую ідэалогію жыцця ў інфармацыйным грамадстве і грамадзянскай супольнасці. Такім чынам, падыход да асэнсавання гісторыі развіцця журналісцкага працэсу павінен быць комплексным, сістэмным. Неабходна імкнуцца да паказу гісторыі медыя праз прызму іх ўзаемадзеяння з грамадскімі інстытутамі, прафесійнымі структурамі, органамі ўлады [2].

У дадзеным кантэксце, на наш погляд, неабходна даследаваць гісторыю медыя ў кантэксце фарміравання і развіцця беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай ідэалогіі. Менавіта гэты метадалагічны прынцып не быў рэалізаваны ў савецкай навуцы. Сёння новыя падыходы да гістарычных даследаванняў, якія называюць «новай сацыяльнай гісторыяй», якраз і накіраваны на вывучэнне асаблівасцей жыццядзейнасці грамадства ў розных аспектах на працягу вялікай гістарычнай эпохі.

У беларускай навуцы менавіта ў апошні час вядзецца праца па стварэнні нацыянальнай гісторыі журналістыкі. У дадзеным кантэксце неабходна звярнуцца да пытання аб пераглядзе этапаў перыядызацыі. За аснову мэтазгодна прыняць найважнейшыя перыяды ў фарміраванні беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Значным падмуркам у гэтым напрамку ўжо сталі навуковы работы прафесара А. Г. Слукі «Беларуская журналістыка» ў 3-х частках (2003–2009), «Беларуская журналістыка»

(2011), манаграфіі па пытаннях фарміравання нацыянальнай ідэалогіі. Менавіта дзяржаўна-палітычны аспект у развіцці журналістыкі заўсёды з’яўляўся дамінуючым. У дачыненнні да гісторыі беларускіх медыя асаблівае значэнне мае і нацыянальны фактар.

У XXI ст. журналістыка набыла рысы сапраўднай навукі. Вызначаны прадмет даследавання, сфарміравана метадалогія. Але без пераасэнсавання гісторыі нельга ўдасканаліць тэорыю. Сучасныя падыходы да вывучэння гісторыі медыя, новыя патрабаванні да яе канцэптуалізацыі як навуковай дысцыпліны будуць садзейнічаць у тым ліку і мадэрнізацыі працэсу журналісцкай адукацыі.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. Есин Б. И. История русской журналистики (1703–1917). М. : Флинта: Наука, 2000. 463 с.
2. Овсепян Р. П. О расширении объекта изучения истории отечественной журналистики XX века // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 10. Журналистика. 2006. № 2. С. 80–92.

## ЦИФРОВОЕ ОБРАЗОВАНИЕ КАК ТРЕНД МЕДИЙНОЙ ГРАМОТНОСТИ

***Л. А. Коханова[1], Ю. Е. Черешнева[2]***

*[1]Московский государственный университет им. М. В. Ломоносова, ул. Моховая, 9, 125009, Москва, Россия, l_kokhanova@mail.ru,*

*[2]Московский государственный университет им. М. В. Ломоносова, ул. Моховая, 9, 125009, Москва, Россия, ulia@chereshneva.com*

Анализируется понятие «цифровое образование» как тренд медийной грамотности, в основе которого понимание современных информационных технологий, их функционала, умение их использовать в профессиональной деятельности и в жизни. Фрагментарно приводятся результаты пилотного исследования «Цифровое образование как конкурентное преимущество будущих журналистов». Обосновываются выводы исследования о необходимости создания вариативных учебных программ по цифровому образованию.

***Ключевые слова:*** цифровое образование; медийная грамотность; медиаобразование; журналистика; информационные технологии; уровни цифрового образования; коммуникация; образовательные программы.